ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЗАРА

орган Брэсцкага абкома КП(б)Б і аблвыканкома

№ 258 (330) | Серада 13 лістапада 1940 г. | Цана 10 кап.

Стварэнне выбарчых акруг па выбарах у Вярхоўны Совет СССР ад Малдаўскай, Літоўскай, Латвійскай і Эстонскай ССР і Акерманскай і Чэрнавіцкай абласцей Украінскай ССР

221 ПП

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР выдаў Указы аб стварэнні выбарчых акруг па выбарах у Совет Саюза і Совет Нацыянальнасцей ад Малдаўскай, Літоўскай, Латвійскай і Эстонскай ССР і ад Акерманскай і Чэрнавіцкай абласцей Украінскай ССР.

Па Малдаўскай ССР створана 8 выбарчых акруг па выбарах у Совет Саюза і 25 акруг па выбарах у Совет Нацыянальнасцей.

Па Літоўскай ССР створана 10 выбарчых акруг па выбарах у Совет Саюза і 25 акруг па выбарах у Совет Нацыянальнасцей.

Па Латвійскай ССР створана 7 выбарчых акруг па выбарах у Совет Саюза і 25 акруг па выбарах у Совет Нацыянальнасцей.

Па Эстонскай ССР створана 4 выбарчых акругі па выбарах у Совет Саюза і 25 акруг па выбарах у Совет Нацыянальнасцей.

Па Акерманскай абласці УССР створана 2 выбарчых акругі па выбарах у Совет Саюза і адна па выбарах у Совет Нацыянальнасцей.

Па Чэрнавіцкай абласці УССР створана 8 выбарчых акругі па выбарах у Совет Саюза і адна па выбарах у Совет Нацыянальнасцей.

(ТАСС).

Выбары ў мясцовыя Советы і насценны друк

Упершыню ў сваім жыцці працоўныя нашай абласці будуць выбіраць сваіх прадстаўнікоў у мясцовыя Советы депутатаў працоўных на аснове Сталінскай Канстытуцыі. У нашай абласці прадстаіць выбраць 6475 депутатаў.

Рабочыя і служачыя, калгаснікі і працоўныя адзіначкі на сваіх сходах кандыдатамі ў мясцовыя Советы высунулі і высоўваюць лепшых людзей бязмежна адданых партыі Леніна-Сталіна, сацыялістычнай радзіме. Зараз наступіў важнейшы перыяд выбарчай кампаніі — перыяд агітацыі за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

У правядзенні выбарчай кампаніі павінен адыграць велізарную ролю ніавы друк фабрык, заводаў, совецкіх устаноў, соўгасаў і калгасаў, а таксама прамысловых арцелей. Яго задача: яркі, пераканаўча і даходчыва папулярызіраваць высунутых і зарэгістраваных кандыдатаў, знаёміць масы з аўтабіяграфіямі, вытворчай і грамадска-палітычнай дзейнасцю кандыдатаў.

Насценныя газеты абавязаны сістэматычна прапагандыраваць Сталінскую Канстытуцыю, на канкрэтных прыкладах расказваць выбаршчыкам розніцу паміж совецкай і буржуазнымі выбарчымі сістэмамі. Растлумачваць выбаршчыкам палітыку нашай партыі і ўрада. Ясна і даходчыва, на канкрэтных мясцовых прыкладах, насценны друк абавязан расказваць аб тых велізарнейшых дасягненнях, якіх дабіўся працоўны народ упартай працай пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі. На фактах дасягненняў свайго горада, раёна, сельсовета, прадпрыемства, соўгаса і калгаса неабходна выхоўваць масы. Нельга забываць і аб бягучых задачах Советаў депутатаў працоўных на далейшай барацьбе за сацыялістычнае будаўніцтва ў вызваленай краіне, а таксама, каб у бліжэйшы час дагнаць усходнія абласці нашай ордэнаноснай рэспублікі.

Большасць рэдкалегій насценных газет зразумелі свае задачы і актыўна ўключыліся ў выбарчую кампанію. Насценныя газеты прадпрыемстваў, устаноў і калгасаў Пружанскага раёна сістэматычна змяшчаюць матэрыялы аб ходзе выбарчай кампаніі. У Дамачэўскім раёне на 10 выбарчых участках рэгулярна, раз у тыдзень, выходзяць насценныя газеты.

Але не ўсе рэдкалегіі зразумелі свае задачы. Многія насценгазеты вельмі мала змяшчаюць матэрыялаў аб ходзе выбарчай кампаніі. Насценная газета „Вызвалены друкар", орган фабкома друкарні імені Варашылава, толькі ў нумары за 7 лістапада змясціла агульны артыкул аб задачах паліграфістаў у выбарчай кампаніі. У насценнай газеце нават адсутнічае матэрыял аб вылучэнні кандыдатаў у депутаты абласнога і гарадскога Советаў. А калектыў рабочых друкарні вылучыў аднаго кандыдата ў абласны Совет і шэсць кандыдатаў у гарадскі Совет. Многія перадавыя рабочыя друкарні з'яўляюцца выдатнымі агітатарамі на выбарчых участках, але аб гэтым у газеце нічога не напісана. Адсутнічае паказ вопыту іх работы. Такое-ж становішча з асвятленнем выбарчай кампаніі ў насценнай газеце дзяржаўнай швейнай фабрыкі „Атэлье мод". Рабочы калектыў гэтай фабрыкі вылучыў кандыдатамі ў депутаты абласнога і гарадскога Советаў 9 чалавек. Усе яны лепшыя людзі народа—стаханаўцы, якія заслугоўваюць давер'е працоўных. Так, кандыдатамі ў гарадскі Совет вылучаны былыя палітзняволеныя: кравец Пашкоўскі, краўчыха Сухаліпская, канструктар-закройшчык Шэр. Гэта людзі, якія настойна змагаліся за сучаснае шчаслівае жыццё працоўных. Яны перанесеі шматлікія катаванні польскай буржуазіі і зараз з'яўляюцца актывістамі ў грамадска-палітычнай рабоце і стаханаўцамі на фабрыцы. Аб такіх людзях трэба пісаць. Насценная газета абавязана агітаваць выбаршчыкаў, каб яны галасавалі за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. Каб забяспечыць такую агітацыю, многім рэдкалегіям неабходна выпускаць спецыяльныя нумары насценгазет, бюлетэні, газеты „Маланкі".

У справе агітацыі даволі вялікую ролю адыгрывае друкаванне аўтабіяграфій кандыдатаў. Жыва і цікава трэба расказваць у насценнай газеце аб жыцці кандыдата, аб тым, як ён змагаўся і змагаецца за справу нашай партыі Леніна-Сталіна, як ён працуе, якім чынам ён заслужыў любоў і павагу ў працоўных. Таксама тут нельга абыходзіць і пытанне, якім павінен быць депутат, якія патрабаванні прад'яўляюць выбаршчыкі, напамінаць кандыдатам, што депутат — гэта слуга народа.

Насценныя газеты абавязаны змяшчаць заметкі самых выбаршчыкаў, асабліва тых, якія бліжэй ведаюць кандыдатаў па сумесным вытворчым, партыйным і грамадскім рабоце.

Зноўка і насценны друк [illegible] справаздачы аб адбываючыхся мітынгах і сходах, расказваць каротка і зразумела аб тым, што было на сходзе.

У насценнай газеце трэба прадаставіць месца і самім кандыдатам, дзе-б яны расказалі аб сваёй вытворчай грамадска-палітычнай рабоце, аб іх планах і задачах, аб барацьбе за задавальненне запросаў выбаршчыкаў.

Рэдкалегіі не павінны забываць аб класавай барацьбе, якая абазлівае вострая праяўляецца зараз, у час выбарчай кампаніі. Класавыя ворагі ўсякімі метадамі будуць стараццa пашкодзіць нашай справе. Там-сям яны паспрабуюць дыскрэдытаваць нашых кандыдатаў. Насценныя газеты павінны выкрываць усякія вылазкі класавых ворагаў.

Задача насценных газет—стаць у перадавых радах барацьбітоў за перамогу сталінскага блока комуністаў і беспартыйных. У выкананні гэтай задачы абавязаны дапамагчы рэдкалегіям партыйныя арганізацыі і рабочыя камітэты партыі. Толькі пад кіраўніцтвам і пры штодзённай дапамозе партыйных арганізацый насценны друк нашай абласці стане сапраўдным прапагандыстам, агітатарам і арганізатарам шырокіх мас працоўных.

Выправіць недакладнасці ў спісах выбаршчыкаў

У Палажэнні аб выбарах у мясцовыя Советы депутатаў працоўных сказана, што спісы выбаршчыкаў Советамі вывешваюцца за 35 дзён да дня выбараў. У даным выпадку спісы павінны былі быць вывешаны 10 лістапада. Але ў асобных сельсоветах і самім горадзе Пружаны спісы выбаршчыкаў вывесілі толькі 11 лістапада. У некаторых месцах безадказна і няўважліва адносіліся да складання спісаў выбаршчыкаў.

На выбарчым участку № 2, дзе старшынёй участковай выбарчай камісіі з'яўляецца тав. Зайцаў, спісы, у якіх лічыцца 1.106 выбаршчыкаў, напісаны розным почаркам, брудна і розначытанымі чарнілами. На адным лісту спіса застаўлена пустымі 16 радкоў.

Дапушчаны недакладнасці ў прозвішчах і імёнах. Так, напрыклад, запісана: „Варшаўская Файга", а трэба было „Варшаўская Фейга". Супроць прозвішча Закроўскага няма імені і імені па бацьку. Многа пераблытана прозвішчаў выбаршчыкаў, у спісах няма агульнага загалоўка.

Не лепш складзены спісы выбаршчыкаў і па выбарчаму участку № 4. Спісы напісаны непісьменна, з дапушчэннем граматычных памылак, з памаркамі і выпраўленнямі. Замест прозвішча Чыжова напісана Ейжова.

Трэба сказаць, што асобныя сельсоветы сур'ёзна адносіліся да складання спісаў выбаршчыкаў. На выбарчым участку № 1, дзе старшынёй участковай выбарчай камісіі з'яўляецца тав. Дубровіна, спісы напісаны чыста, без выпраўленняў, поўнасцю ўказаны адрасы выбаршчыкаў. Надрэнна складзены спісы і на выбарчым участку № 3.

Лінёўскі сельсавет своечасова прыдбагнаў да работы па складанню спісаў выбаршчыкаў совецкі актыў і настаўнікаў і вывесіў спісы ў тэрмін — 10 лістапада. Своечасова вывесілі спісы выбаршчыкаў у Дабучынскім, Малецкім і іншых сельсоветах.

Спісы выбаршчыкаў вывешаны па ўсім раёне. Задача сельскіх Советаў і выбарчых камісій заключаецца ў тым, каб зараз жа выправіць дапушчаныя памылкі, скажэнні і недакладнасці ў спісах выбаршчыкаў.

М. Г.

Вынікі бе[illegible]лапотнасці

(На выбарчых [illegible]стках [illegible]да)

— Маякоўскі выбарчы ўчастак [illegible] — чытаем мы на неахайна напі[illegible]най невялікай шыльдзе, прыбі[illegible] на дзвярах музыкальнага вуч[illegible]шча, што па Пушкінска[illegible]ліцы.

Заходзім у памяшканне. [illegible] дажджамі на другім паверсе [illegible] невялікім пакойчыку на сценах знаходзім спіс выбаршчыкаў. З пачатку нас узрадвалі акуратна запоўненыя прыгожым каліграфічным почаркам лісты. Але хутка, калі мы пачалі праглядаць спісы, [illegible] расстраіваць [illegible] і чаго тут толькі не напісана:

Малодзш жанчыны Лінчук Фе[illegible] Григор'еўну саставіцелі спісаў абрылі старухі. У графе: „год нараджэння" замест 1915 напісана 1818. Цэлую сотню год дадалі, да чаго шчодрыя людзі! У выбаршчыка Рудоўскага Шлёмы запісана імя „Шлома". У графе „год нараджэння" запісана 1, не ўказана месца жыхарства.

У грамадзянкі Эпштэйн Фейгі ніяк не разбярэш, якога яна года нараджэння: 1920 альбо 1930. Грамадзянін Фанаберыя Носх Шлёмавіч па волі саставіцеляў спісаў нарадзіўся ў... 1892 годзе. Год нараджэння ў Раманенкі Марыі Фёдараўны запісан 1930.

Можна прывесці дзесяткі такіх „перлаў", якія з'яўляюцца вынікам безадказных адносін работнікаў горсовета да складання гэтага важнейшага дакумента, як спісы выбаршчыкаў.

Нельга сказаць, каб у гарадскім совеце пытаннем складання спісаў не займаліся. Тут не мала пашумелі на нарадах, пасяджэннях, адрывалі ад работы дзесяткі людзей і ў выніку не пракантраліраваўшы іх работы атрымаліся такія вынікі.

Многія вучні музыкальнага вучылішча скардзяцца на тое, [illegible] ў спісы, хоць [illegible] на [illegible]ыторы[illegible] [illegible]ць звы[illegible]саў ніхто з чле[illegible] камісіі не дзяжурыць.

Мы дакіраваліся [illegible] шэфскі выбарчы ўчастак [illegible] надзеяй знайсці там [illegible] радак. Там думалі ўсе [illegible] ўчастак [illegible] дзіцяці в горсовета.

[illegible] Разгі[illegible] месцах шыкуюць [illegible] не знаходзім [illegible].

Блукаем па пакоях, адры[illegible] людзей ад работы, распы[illegible] дзе ўчастак і ўсе пацікаўцеся [illegible]чамі. Толькі ў сакратара гор[illegible] тав. Іванова[illegible] удаецца [illegible] ведацца, што ўчастак павінен [illegible] ходзіцца ў дварэ горсовета.

Зноў пошукі. Нарэшце [illegible] даём людзей, якія нам адказва[illegible], што „тут павінен быць учас[illegible] але пакуль яго няма". Спіс[illegible] яшчэ не вывешаны.

Пабывалі мы і ў памяшканн[illegible], прадназначаных для выбарчых участкаў—у клубе электрастанцыі і ў бібліятэцы імені Горкага. У першым месцы нікога не знайшлі, а ў бібліятэцы нам адказалі, што тут павінен быць участак, але, відаць, не хутка яго абсталююць, бо патрэбна рабіць рамонт.

...І усё гэта адбываецца 12 лістапада, калі на ўчастках, згодна Палажэння аб выбарах, павінны ўжо два дні вісець акуратна складзеныя спісы выбаршчыкаў.

Такая бесклопатнасць і нядбайнасць кіраўнікоў горсовета і старшынь участковых выбарчых камісій не дараванальна!

Я. Зарэцкі.

г. Брэст.

Распачаўся прызыў моладзі ў рамесленыя і чыгуначныя вучылішчы і школы ФЗА.

Першы дзень работы гарадской камісіі

10 лістапада ў горвыканкоме адбылося першае пасяджэнне гарадской камісіі па прызыву моладзі ў рамесленыя і чыгуначныя вучылішчы і школы фабрычна - заводскага абучэння. Камісія ў складзе старшыні тав. Салаўя, членаў Арцем'ева і Гельпенштайна і ўрачоў разгледзела 22 заявы. Усе выкліканыя на пасяджэнне камісіі 22 юнакі прайшлі медыцынскі агляд.

Згодна пастановы прызыўной камісіі 10 чалавек залічаны ў рамесленыя вучылішчы гор. Брэста, 10 — у школы фабрычна-заводскага абучэння ў гор. Гайнаўцы і 1 чалавек — у школу фабрычна-заводскага абучэння ў Белавежы.

Залічаныя ў школы ФЗА і вучылішчы ў асноўнай масе дзеці рабочых, якія жадаюць набыць сабе спецыяльнасць і працаваць на сацыялістычных прадпрыемствах. У сваіх заявах яны выказваюць шчырую ўдзячнасць партыі і ўраду за сталінскія клопаты аб моладзі. Яны абавязваюцца чэсна і аддана працаваць на карысць сацыялістычнай радзімы і штодзённа ўмацоўваць яе абароназдольнасць.

Вісман.

МАЛАДЫЯ ПАТРЫЁТЫ

[illegible]ючых патрыётаў пісьмо. Барыс [illegible] Карпук і Канстанцін Федарук у [illegible] пісьме пішуць:

[illegible] Тавар[illegible]ш старшыня! Як там [illegible]ём у чы[illegible]гуначную шко[illegible]. Во мы чакаем з нецярпе[illegible]ння. [illegible]тыма вы ведаеце, калі [illegible] [illegible]е працаваць. Паведаміце нам [illegible]

[illegible] краіне, пад [illegible] [illegible] Федарука, безумоўна, [illegible] абудуцца. Ім будзе прадаставлена [illegible] магчымасць набыць сабе жаданыя спецыяльнасці.

Н. Лагвінюк,

старшыня Раснянскага сельсовета, Высокаўскага раёна.

У Галоўным Упраўленні Працоўных Рэзерваў

У адпаведнасці з п. 5 Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета Саюза ССР „Аб дзяржаўных Працоўных Рэзервах СССР" начальнік Галоўнага Упраўлення Працоўных Рэзерваў тав. Маскатаў выдаў загад аб форме вопраткі, выдаваемай за кошт дзяржавы, навучаючымся рамесленых і чыгуначных вучылішч. Форма вопраткі зацверджана Соўнаркомам Саюза ССР.

Для навучаючыхся рамесленых і чыгуначных вучылішчаў зацверджана наступная форма вопраткі:

Шынель чорная, двухбортная, з грубасатуновага сукна. На каўнеры шынелі пятліцы з кантам цемнасінага колеру—для навучаючыхся рамесленых вучылішчаў і з кантам малінавага колеру — для навучаючыхся чыгуначных вучылішчаў. На пятліцах шынеляў навучаючыхся рамесленых вучылішчаў прымацаваны металічныя літары Р. У. і цыфры, якія ўказваюць нумар вучылішча. На пятліцах шынеляў навучаючыхся чыгуначных вучылішчаў прымацаваны металічныя літары Ж. У. і цыфры, якія ўказваюць нумар вучылішча. Гузікі на шынелі металічныя, на якіх паказаны перакрыжаваны малаток і гаечны ключ.

Фуражка чорная, суконная з фібравым казырком і рамешком. Канты цёмнасінага колеру на фуражках навучаючыхся рамесленых вучылішчаў і канты малінавага колеру на фуражках навучаючыхся чыгуначных вучылішчаў. Значкі на фуражках—металічныя, на якіх паказаны перакрыжаваны малаток і гаечны ключ.

Гімнасцёрка чорная альбо цёмнасінага колеру з бавоўнанапаміраваяй тканіны. Гузікі на гімнасцёрцы металічныя, на якіх паказан перакрыжаваны малаток і гаечны ключ.

Штаны суконныя, чорнага або цёмнасінага колеру (штаны носяцца на выпуск).

Рамень паясны з белай металічнай аблягай. На блясе паясного рамня навучаючыхся рамесленых вучылішчаў літары Р. У. На блясе паясного рамня навучаючыхся чыгуначных вучылішчаў літары Ж. У.

Чаравікі скураныя чорныя.

УКАЗ

ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Аб дні выбараў у Вярхоўны Совет СССР ад Малдаўскай ССР, Акерманскай і Чэрнавіцкай абласцей Украінскай ССР, ад Літоўскай ССР, Латвійскай ССР і Эстонскай ССР

1. Назначыць выбары депутатаў у Вярхоўны Совет СССР ад Малдаўскай ССР, Акерманскай і Чэрнавіцкай абласцей Украінскай ССР, ад Літоўскай ССР, Латвійскай ССР [illegible] ССР на 12 студзеня 1941 года.

2. Аб'явіць пачатак выбарчай кампаніі [illegible] Совет СССР ад гэтых рэспублік і абласцей з 12 лістапада [illegible] года.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага [illegible] СССР М. КАЛІНІН

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага [illegible] А. ГОРКІН

Масква, 11 лістапада 1940 года.



Кіраўнік агітканектыва в-га Новагрудскага выбарчага участка дырэктар польскай сярэдняй школы Ф. З. Баржэмскі праводзіць семінар агітатараў.

Фота В. Лупейка. *Фотахроніка Белта.*

Выбары ў Вярхоўны Совет УССР ад Акерманскай і Чэрнавіцкай абласцей Украіны

КІЕЎ, 11 лістапада. (ТАСС). Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета УССР на 12 студзеня 1941 года назначаны выбары депутатаў у Вярхоўны Совет УССР ад Акерманскай і Чэрнавіцкай абласцей Украіны.

Пачатак выбарчай кампаніі ў гэтых абласцях аб'яўлен 12 лістапада 1940 года. Створана 16 выбарчых акруг па выбарах у Вярхоўны Совет УССР: 7 у Акерманскай абласці і 9 у Чэрнавіцкай абласці.

ХРОНІКА

Соўнарком СССР назначыў тав. **Лебедзева І. М.** намеснікам Народнага Камісара знешняга гандлю.

Соўнарком СССР вызваліў ад абавязкаў намесніка Народнага Камісара знешняга гандлю тав. **Кушэрэва В. І.**

(ТАСС).

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

Ахопім большэвіцкай агітацыяй кожнага выбаршчыка

Наша первічная партарганізацыя абслугоўвае 33-і выбарчы ўчастак. Для правядзення агітацыйна-масавай работы сярод выбаршчыкаў участка партарганізацыяй створан агіткалектыў з 4[illegible] чалавек комуністаў, комсамольцаў і беспартыйнага актыва.

Партарганізацыя ўлічвала, што поспехі ў гэтай справе будуць залежаць выключна ад належнай падрыхтоўкі самих агітатараў, своечасовай і канкрэтнай ім дапамогі.

Я, як сакратар партарганізацыі і віраўнік агіткалектыва, уважліва сачу за самастойнай работай кожнага агітатара па павышэнню яго палітычнага ўзроўню.

У кастрычніку праведзена два семінары для агітатараў. На першым семінары абмеркаваны пытанні: аб давядзенні да выбаршчыкаў Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб назначэнні дня выбараў у мясцовыя Советы депутатаў працоўных у заходніх абласцях БССР і пачатку выбарчай кампаніі. На гэтым-жа семінары мы разабралі парадак арганізацыі вывучэння выбаршчыкамі выбарчага закона і Сталінскай Канстытуцыі. Глыбока вывучылі першы і другі раздзел выбарчага закона. На другім семінары агітатарам быў зроблен інструкцыйны даклад аб 23 гадавіне Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Агітатары на семінары праяўляюць вялікую актыўнасць, задаюць многа пытанняў.

На ўчастку зараз працуе 15 гурткоў, у іх займаецца 150 чалавек. У некаторых гуртках праведзена па 4 заняткі. Выбаршчыкі праяўляюць вялікую цікавасць да вывучэння выбарчага закона і Сталінскай Канстытуцыі. На занятках яны з'яўляюцца своечасова і прымаюць актыўны ўдзел. У сваіх выступленнях расказваюць аб сваім бяспраўным жыцці пры ўладзе польскіх памешчыкаў і капіталістаў, дзеляцца вопытам сучаснай работы.

Да агітатара т. Бурмакіна адзін стары рабочы чыгуначнік звярнуўся з просьбай растлумачыць, як атрымаць пенсію. Агітатар не быў знаём з такім пытаннем і ён абацаў даклас[illegible] дацца ў адпаведных органах. Гэты адказ на чарг[illegible] запытанне гуртка.

Тав. Бурмацкі на заўт[illegible] гутарыў па гэтым пытанн[illegible]

[illegible] мы падкрэсліваем, каб агітатары ўлічвалі ўсе запросы [illegible] поўных, давалі правільныя і [illegible]умелыя адказы. І гэтага мы [illegible] дабіліся ад большасці агі[illegible]раў.

Многія нашы агітатары здолелі [illegible]бра арганізаваць сваю работу з выбаршчыкамі. Кандыдат партыі [illegible] Каструбенка правяла чатыры заняткі гуртка. Па кожнай тэме гуртаркі мае канспект, карыстаецца [illegible] наглядным дапаможнікамі. [illegible] гутарцы яна звязвае з міжнародным фактамі з мінулага жыцця [illegible] поўных Брэста і ўсёй заходняй Беларусі, з фактамі паспяховага будаўніцтва новага сацыялістычнага жыцця на вызваленай [illegible]лі. Невыпадкова гутарка ў [illegible]

гуртку праходзіць жыва і цікава, выклікае ажыўлёны абмен думкамі слухачоў.

Шырока разгарнулі агітацыйную работу на ўчастку агітатары тт. Бярукоў, Маліновіч, Баршак, Гесельцын, Заяц, Самусенка, Асіповіч, Арынмена і Галубоў. Акрамя рэгулярнага правядзення заняткаў у гуртках, яны ахапілі індывідуальнымі гутаркамі ўсіх выбаршчыкаў шляхам падворнага абыходу. Амаль усе агітатары прынялі актыўны ўдзел у праверцы спісаў выбаршчыкаў. Па ўчастку ўсе выбаршчыкі занесены ў спісы. Праверка спісаў была звязана з правядзеннем індывідуальных гутарак з выбаршчыкамі аб задачах выбарчай кампаніі ў мясцовыя Советы депутатаў працоўных. Такімі гутаркамі ахоплена больш 700 выбаршчыкаў.

Аднак наша партарганізацыя яшчэ не дабілася належнай арганізацыі агітацыйна-масавай работы на ўчастку. Зусім нязначная колькасць выбаршчыкаў ахоплена гурткамі па вывучэнню выбарчага закона і Сталінскай Канстытуцыі. Некаторыя агітатары нават не прыступілі да работы (кандыдаты партыі тт. Парутчыкава і Варцэва), індывідуальныя гутаркі з гэтымі таварышамі не далі станоўчых вынікаў. Зараз аб іх справа будзе разглядацца на партыйным сходзе.

Партарганізацыя паставіла сваёй задачай уключыць усіх агітатараў у актыўную работу для разгортвання агітацыі за выстаўленых кандыдатаў, ахопу ўсіх выбаршчыкаў гурткамі па вывучэнню выбарчага закона і Сталінскай Канстытуцыі. Гэтага наша партыйная арганізацыя дабіецца ў бліжэйшыя дні.

Ф. П. Судзілін,
сакратар первічнай партарганізацыі ст. Брэст-Цэнтральны.

Заслужаная крытыка

На абдыўшымся сходзе комсамольскага актыва Высокаўскага раёна быў заслуханы і абмеркаваны даклад сакратара райкома ЛКСМБ тав. Палякова аб выніках работы XIV з'езда комсамола Беларусі.

Выступіўшы ў спрэчках таварышы рэзка крытыкавалі гайком за недастатковую дапамогу ў рабоце первічных арганізацый. Тав. Багачэк у сваім выступленні адзначыў, што райком комсамола вельмі марудна выконвае рашэнні першай раённай канферэнцыі ЛКСМБ. Первічныя комсамольскія арганізацыі прадастаўлены самі сабе, комсамольскі актыў да іх заглядае вельмі рэдка, а калі хто і бывае, то не ўнікае глыбока ў работу арганізацыі. Ёсць выпадкі парушэння [illegible]ная комсамольскай дысцыпл[illegible] комсамольцы тт. Сакратаў, [illegible]ова зайняцца п'янкай.

Тав. Шупін у сваім выступленні расказаў, што сакратар первічнай арганізацыі раёвыканкома тов. Ідзельсон развалі[illegible] работу арганізацыі. Комсамольская гаспадарка знаходзіцца ў хаос[illegible]ным становішчы. Пратаколы, [illegible]цавальныя талоны, ведамасці, [illegible]ляцца дзе папала.

Многа гаварылі на сходзе актыва комсамольцы аб дрэнным становішчы абаронна-фізкультурнай работы.

С. Мі[illegible]льча

Лекцыя аб жыцці і дзейнас[illegible] І. [illegible]

[illegible] у весцы Сошчыцы, Бяроза[illegible] [illegible]ніга раёна, сакратаром райк[illegible]

[illegible] наладжаліся
В. Гмыр.



Пры Кішынёўскім гаркоме партыі арганізавана кансультацыя па асновах марксізма-ленінізма і „Кароткаму курсу гісторыі ВКП(б)". Кансультацыя па гісторыі ВКП(б). Справа налева — І. Г. Шорынаў (кансультант гаркома), С. П. Ярмаш (эканаміст упраўлення народна-гаспадарчага ўліку), М. І. Липскер (лабарантка фармацэўтычнай фабрыкі) і О. Я. Кіро (юрыст).

Фота В. Іванова. *Фота ТАСС.*

У Брэсце арганізавана арцель мастацкай вышыўкі, у якой працуе 60 чалавек. Члены арцелі за работай.

Фота Е. Халдзея (фотахроніка Белта).

Арганізацыйную работу спалучаць з выхаваўчай

Днямі адбыўся справаздачна-выбарчы сход арганізацыі МОПР хлебакамбіната. Наша арганізацыя за прайшоўшы перыяд правяла значную арганізацыйную работу. Членамі МОПР з'яўляюцца ў нас 238 чалавек з 265 рабочых і служачых, якіх налічвае камбінат. За час свайго існавання праведзена 11 сходаў, зроблена 6 дакладаў аб міжнародным становішчы. Сабрана добраахвотных узносаў звыш 1000 рублёў. У пякарні № 4 ёсць МОПР'аўская брыгада, якая працуе добра, перавыконвае план і выпускае добраякасную прадукцыю.

Але трэба сказаць, што работа па інтэрнацыянальнаму выхаванню намі праведзена яшчэ зусім недастатковая. Зусім слаба ўцягнуты ў работу працаўнікі канторы; [illegible]ярных № 5, 6 многія раз[illegible] да гэтага часу не разумеюць [illegible]чэння і задачы МОПР'аўскай [illegible]ганізацыі. Ёсць у нас комсамо[illegible] тав. Капечын, які мае [illegible]раўскі білет, а больш года не [illegible]ціў членскіх узносаў.

[illegible] сходзе выбрана бюро ў [illegible]оці 7 чалавек і рэвізійная [illegible]. Побач са старымі актыў[illegible] кіруючы орган выбраны [illegible]ныя таварышы.

[illegible]віраючыся на актыў, новае [illegible] павінна прыняць усе меры да разгортвання інтэрнацыянальна-выхаваўчай работы. У прыватнасці зараз наша задача заключаецца ў тым, каб дабіцца актыўнага ўдзелу ўсіх мопраўцаў у выбарчай кампаніі.

І. З. Бахмат.

Па слядах неапублікаваных пісем

Селянін Палкоў прыслаў у рэдакцыю пісьмо аб тым, што Бярозаўская райкантора сувязі дрэнна работае. Пісьмы засылаюцца ў тыя сельсоветы, у якія яны не адрасаваны, няправільна афармляюць і выклікаюць абанентаў для міжгародніх перагавораў.

Начальнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення сувязі тав. Немірэўскі, якому было нак разана пісьмо на рэагаванне, паведаміў рэдакцыі, што пры праверцы работы Бярозаўскай канторы сувязі былі указаныя факты пацвердзіліся.

За халатныя адносіны начальнік Бярозаўскай райканторы сувязі Пілецкі з работы знят.

НА ТЭМЫ ДНЯ

АБ ПЕРАПРАВЕ ПРАЗ МУХАВЕЦ

Аднойчы дажджлівым вечарам на беразе Мухаўца адбылася наступная сустрэча, аб якой варта расказаць. На левым беразе, ля месца лодачнай пераправы стаяў грамадзянін і крычаў.

— Перапраўшчык, давай ло-о-дку.

Вецер падхватваў гэтыя словы і рэха дзесьці далёка раставала ў начной цемры. Чалавек навастрыў слух і з надзеяй паглядаў на правы бераг. Але там не было і жывой душы. Толькі хвалі сардзіта пласкаліся аб бок лодкі і на слупу слепа мігала электрычная лямпачка.

Дождж усё больш павялічваўся. Вадзяныя кроплі назойліва падалі за каўнер кажушка.

— Л о-о-о-дку.

Крычаў грамадзянін, але і на гэты раз яму злосна адказвалі толькі хвалі. Так пастаяў ён з поўгадзіны. Нарэшце на другім беразе паказалася чалавек пяць пасажыраў. Адзін з іх, відаць больш вопытны, адлучыўся ад групкі іх і праз некалькі мінут з'явіўся з заспаным чалавекам, у руках якога было вёсла.

— Пыпрамнуў крыху, — гаварыў перапраўшчык пасажыру, і, пазяхнуўшы, працягваў, — смачна спіцца ў дождж.

А з таго берагу чалавек крычыць.

— Адзін, — запытвае перапраўшчык.

— Так.

— Глупства. За пятнаццаць капеек я не буду мокнуць пад дажджом.

І што-ж вы думаеце. Нават тады, калі лодка прыбыла на другі бераг, вымакшаму да ніткі пасажыру не адразу ўдалося пагадзіцца на „мацярык". Перапраўшчык абінуўся ў будцы бакенчыка і там катэгарычна заявіў наступаўшаму на яго пасажыру, што пакуль не сабяруцца некалькі чалавек ён не паедзе на другі бераг.

Гэтая гісторыя не надумачая. Пагаварыце з жыхарамі Валынкі і Сої і яны вам раскажуць аб дзесятках такіх гісторый. Зачастую людзі чакаюць цэлую ноч на беразе для таго, каб пераправіцца праз Мухавец.

Каля трох тысяч жыхароў прадмесця Валынкі і Сої з-за дрэннай арганізацыі пераправы адарваны ад горада і пазбаўлены магчымасці нарэдка своечасова паспець па работу ў прадпрыемствы, установы і арцелі.

А ці нельга арганізаваць сталую пераправу праз Мухавец? Вядома, магчыма. Патрэбна толькі, каб на Брэсцкай прыстані, у горсавеце занялася гэтым пытаннем.

Вясной праз Мухавец быў зроблен невялічкі пантонны мост, але яго чамусьці разбурылі і замянілі лодкай, у якую ледзь змяшчаецца 20 чалавек. Да рэчы, плата за пераезд з кожным днём мяняецца. Законнае абурэнне выклікаюць паводзіны крайнікоў Брэсцкай прыстані. За пераправу чалавека бяруць 15 капеек, а за веласіпед 30 кап. Чаму?

Пакуты грамадзяніна не канчаюцца толькі пераправай праз Мухавец. Вось паспрабуйце дабрацца ад Мухаўца да Валынкі па дарозе, на якой многа грязі і ям.

Аднойчы [illegible] і працы, адсюль [illegible]тычнае спабораніцтв[illegible]ух, які ўжо так м[illegible] краіне

АРГАНІЗАВАЦЬ РАМОНТ ТРАКТАРАЎ

Жыхары Валынкі не раз узнімалі пытанне аб лепшай арганізацыі пераправы і будаўніцтва дарогі, але чамусьці на іх патрабаванні з гарадскога выканкома нічога не адказваюць.

* * *

Наша вобласць у асноўным закончыла сельскагаспадарчыя работы. Вялікую дапамогу маладым калгасам і бяднякам — серадняцкім гаспадаркам у правядзенні палявых работ аказалі створаныя ў кожным раёне машына-трактарныя станцыі. Многія з іх выдатна папрацавалі на палях вызваленай зямлі.

Паспяхова справіліся з сваімі задачамі, датэрмінова выканаўшы гадавыя вытворчыя планы, Клясчэльская, Жабінкаўская, Высокаўская, Камянецкая машына-трактарныя станцыі. Тут за прайшоўшы год выхаваны дзесяткі выдатных майстроў сацыялістычнай працы, трактарыстаў-стаханаўцаў, якія на многа перакрылі даведзеныя да іх заданні па ворыву і іншых работах.

Аднак трэба прызнаць, што рад машына-трактарных станцый абласці працавалі ў гэтым годзе вельмі дрэнна. Да такіх у першую чаргу трэба аднесці Маларыцкую, Дывінскую, Кобрынскую, Пружанскую і інш. Асноўная прычына ганебнага адставання гэтых машына-трактарных станцый з'яўляецца дрэнная падрыхтоўка матэрыяльнай базы. Трактары ў асобных выпадках адпраўляліся на ўчасткі тэхнічна неспраўнымі, у выніку чаго яны больш стаялі, чым працавалі.

Зараз машына-трактарныя станцыі распачынаюць рамонт трактарнага парка і іншых сельскагаспадарчых машын. Рамонт трактараў — важнейшае мерапрыемства ў падрыхтоўцы да палявых работ у будучым годзе. Вопыт паказвае, што там, дзе загадзя і з большэвіцкім стараннем бяруцца за рамонт, дзе яго праводзяць не абы як, а высокаякасна, там трактары работаюць на поўную магутнасць і забяспечваецца перамога ў выкананні і перавыкананні плана.

Між тым гэтай простай ісціны не ўсвядомілі яшчэ многія кіраўнікі машына-трактарных станцый. Рамонт трактараў разгортваецца вельмі марудна. Да гэтага часу ў вобласці адремантавалі бягучым рамонтам усяго 3 трактараў.

Дамачэўская і Маларыцкая машына трактарныя станцыі, надаючы выключна важнае значэнне своечасоваму і высокаякаснаму рамонту трактараў, уступілі памі[illegible] сабой у сацыялістычнае спаборніцтва за лепшы рамонт машын. Гэты каштоўны пачын павінны падхапіць усе машына-трактарныя станцыі. Кожная МТС, на аснове шырокага разгортвання сацыялістычнага спаборніцтва і стаханаўскага руху, наўхільнай барацьбой за строгае выкананне Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня і 10 ліпеня гэтага года, абавязана па-баявому арганізаваць рамонт трактараў і правесці яго высокаякасна ва ўстаноўлены тэрмін. На рамонт трэба паставіць лепшых трактарыстаў-стаханаўцаў, якія на выдатна авалодалі тэхнікай сваёй справы.

ВЯЛІКІЯ ЗАВАЯВАННІ ПРАЦОЎНЫХ СССР

Права на працу

Права на працу несумяшчальна з існаваннем капіталістычнага грамадства. Хоць некаторыя буржуазныя дэмакраты і спрабавалі [illegible]вазгласіць гэтае права, але [illegible] заставалася ў іх вуснах толькі прыгожай фразай, выдуманай для ашуканства народа.

Беспрацоўе — такі-ж немінучы спадарожнік капіталізма, як і [illegible]намічныя крызісы і войны. Пакуль існуе капіталістычная сістэма гаспадаркі з яе эксплуатацыяй чужой працы, з яе анархіяй вытворчасці, з узбагачэннем нямногіх за кошт разарэння і збяднення мас, да таго часу будзе існаваць і беспрацоўе.

Капіталісты зусім не запікаўцеся ў ліквідацыі беспрацоўя і гарантыраванні працоўным права на працу. Чым больш беспрацоўных і галодных пролетарыяў, тым таннейшай рабочыя рукі, тым выгадней капіталістам.

Толькі ў сацыялістычнай дзяржаве, дзе знішчаны эксплуататарскія класы, дзе няма эксплуатацыі чалавека чалавекам, дзе ўсё народ работае на сябе, на сваё грамадства, — толькі ў такой дзяржаве магчыма праваслашэнне права на працу ў законадаўчым парадку.

Артыкул 118-ты Сталінскай Канстытуцыі СССР гаворыць: „Грамадзяне СССР маюць права на працу, гэта значыць права на атрыманне гарантыраванай работы з аплатай іх працы ў адпаведнасці з яе колькасцю і якасцю.

Права на працу забяспечваецца сацыялістычнай арганізацыяй народнай гаспадаркі, наўхільным ростам вытворчых сіл совецкага грамадства, ухіленнем магчымасці гаспадарчых крызісаў і ліквідацыяй беспрацоўя".

* * *

Не трэба думаць, што беспрацоўе ў СССР было ліквідавана адразу, як толькі ў 1917 годзе адбылася Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя. Беспрацоўе, хоць і ў невялікіх памерах, існавала ў Совецкім Саюзе яшчэ год 18 пасля заваявання ўлады працоўнымі. Не адразу Краіна Советаў ператварылася ў магутную індустрыяльную дзяржаву, якой яна з'яўляецца цяпер. Рабочаму класу прыйшлося многа і доўга работаць, перажыць немала нягод, перш чым у краіне перамагла сацыялістычная сістэма гаспадаркі.

Наш народ атрымаў ад старога рэжыма вельмі адсталую гаспадарку, да таго-ж зруйнаваную імперыялістычнай і грамадзянскай войнамі. На працягу пяці год (1920—1925) гг.) у краіне інтэнсіўная работа над аднаўленнем прамысловасці, транспарта, сельскай гаспадаркі. Калі гэта задача была выканана, Краіна прыступіла да рэканструкцыі народнай гаспадаркі, да будаўніцтва магутнай прамысловасці.

* * *

Вялікі Ленін вучыў, што сацыялізм можна пабудаваць толькі тады, калі краіна створыць буйную прамысловую індустрыю. Выходзячы з гэтага палажэння, геніяльны прадаўжальнік справы Леніна таварыш Сталін прапанаваў грандыёзную праграму індустрыялізацыі СССР, з энтузіязмам прынятую рабочым класам. Пачалося гіганцкае будаўніцтва велізарных трастаў, фабрык, заводаў, шахт, чыгунак.

Небывалы размах сацыялістычнага будаўніцтва выклікаў каласальны попыт на рабочую сілу. Мільёны новых рабочых уліваліся ў будаўніцтва і ў індустрыю. За перыяд з 1923—1924 па 1930 год колькасць рабочых і служачых вырасла з 7 мільёнаў 300 тысяч чалавек да 14 мільёнаў 500 тысяч чалавек, гэта значыць амаль у два разы. А зараз, у 1940 годзе, колькасць рабочых і служачых дасягае ўжо 28 мільёнаў чалавек.

Індустрыялізацыя краіны выклікала глыбокі пераварот у сельскай гаспадарцы СССР. Трактар адыграў велізарную рэвалюцыянізуючую ролю ў вёсцы. Сялянства зразумела, што толькі на шляхах калектыўнай, машыннай апрацоўкі зямлі вёска знойдзе выхад з вечнай нястачы і забітасці да новага, светлага і радаснага жыцця.

З 1929 года пачалася масавая арганізацыя калгасаў. Сяляне пераканаліся, што калектыўная гаспадарка, заснаваная на перадавой тэхніцы, у варані мяняе ўмовы сялянскага жыцця, што вёска перастае быць мачыхай для бедных сялян.

Індустрыялізацыя краіны і перамога калгаснага ладу ў вёсцы прывялі да канчатковай ліквідацыі беспрацоўя.

Да канца 1930 года біржы працы закрыліся, беспрацоўных у СССР больш не было.

* * *

Права на працу — найвялікшае заваяванне рабочага класа СССР. Вялікае значэнне для чалавека адчуваць, што яго сілы, яго здольнасці заўсёды знойдуць прыменне, што яго асабістае жыццё, свабода, становішча ў грамадстве залежаць ад яго самога, ад колькасці і якасці яго працы.

Успамінаюцца словы таварыша Сталіна, сказаныя ім прадстаўніку амерыканскага друку Рой Говарду: „Мне цяжка ўявіць сабе, якая можа быць „асабістая свабода" у беспрацоўнага, які ходзіць галодным і не знаходзіць прымянення сваёй працы. Сапраўдная свабода ёсць толькі там, дзе знішчана эксплуатацыя, дзе няма прыгнечання адных людзей другімі, дзе няма беспрацоўя і жабрацтва, дзе чалавек не дрыжыць за тое, што заўтра можа страціць работу, жыллё, хлеб".

Праца ў нашай краіне авеяна славай. Хто чэсна і добрасумленна працуе, таго цэніць і паважае грамадства. У гэтым — сэнс сацыялістычнага прынцыпа працы: „Ад кожнага па яго здольнасцям, кожнаму па яго [illegible] працоўны [illegible] штоён[illegible] для таго [illegible] жава стала яшчэ [illegible]тнай, каб абароназдольн[illegible] была яшчэ вышэй.

Адсюль — [illegible] і праці[illegible]

і які прадаўжае развівацца ўшыр і ўглыб.

* * *

Маё асабістае жыццё, мая біяграфія, уяўляе сабой адну з многіх яркіх ілюстрацый тых змен, якія вясе з сабой свабодная праца ў сацыялістычным грамадстве.

На працягу некалькіх год я прайшоў шлях ад цёмнага неграмотнага батрака, за грашы працаўшага ў кулака, да кваліфікаванага рабочага-стаханаўца, пастаўляўшага некалькі совецкіх рэкордаў прадукцыйнасці працы на фрэзерным станку. Цяпер я депутат Вярхоўнага Совета СССР ад Ленінскай выбарчай акругі горада Масквы і студэнт Прамысловай акадэміі імені Кагановіча. Рыхтуюся стаць інжынерам.

Хіба пры капіталізме рабочы можа марыць аб такім жыцці, якім жывем мы, совецкія рабочыя?

Што магла-б мне даць праца на капіталіста? Каб атрымаць званне майстра, мне трэба было-б работаць цяжка год 20—25, калі не больш. А колькі знавог і ўніжэння прышлося-б перанесці!

Я паступіў на сацыялістычны завод. То быў час, калі ўвесь [illegible]бочы клас СССР быў акоплен пафасам асвоєння новай [illegible] Глыбока ў сэрца ма[illegible] вы правадыра наро[illegible] Сталіна, што чала[illegible]

На акруговай прадвыбарчай нарадзе

10 лістапада, у 8 гадзін вечара, у абласны Дом партыйных саветы сабраліся прадстаўнікі калектываў рабочых і служачых водачнага завода „Вызваленая праца", абласной друкарні імені Варашылава, гарадской электрастанцыі, служачых аблвыканкома, пошты і медыцынскіх работнікаў. Тут адбылася прадвыбарчая акруговая нарада Цэнтральнай выбарчай акругі № 5 па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных.

Упершыню ў сваім жыцці, — гаворыць рабочы абласной друкарні тав. Ольдак, — мы свабодна рыхтуемся да выбараў у мясцовыя органы совецкай улады на аснове самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі. Успомнім, таварышы, наша недалёкае мінулае. Каго выбіралі ў мясцовыя органы самакіраўніцтва ў былой панскай Польшчы? Выбіралі багатых, памешчыкаў, капіталістаў, буйных гандляроў. Яны клапаціліся толькі аб сабе, абаранялі інтарэсы буржуазіі. Выбрукаваная вуліца была тая, дзе жылі капіталісты і гандляры. Запушчаная і брудная вуліца была тая, дзе жыла рабочая беднота. Вазьміце ў нашым горадзе вуліцу Шырокую, зараз імені Куйбышева. Яна пры ўладзе польскіх паноў была самая брудная, запушчаная, бо там жылі рабочыя, беспрацоўныя. Такая была палітыка панскай улады.

Совецкая ўлада праяўляе сталінскія клопаты аб працоўных. Мы сёння павінны падтрымаць кандыдатуру Дульчэўскай. Будучы дэпутатам у абласным Совеце, яна будзе клапаціцца аб працоўных. Дульчэўская з'яўляецца стаханаўкай, на практычнай рабоце яна даказала, што ў яе няма іншых інтарэсаў, як інтарэсы радзімы, інтарэсы народа. Па аднадушнай думцы калектыва рабочых і служачых друкарні я падтрымоўваю кандыдатуру тав. Дульчэўскай.

Усяго на нарадзе выступіла 8 чалавек. Затым слова ўзяла тав. Екацярына Вікенцьеўна Дульчэўская. Яна кароткa расказала сваю аўтабіяграфію. Яе жыццёвы шлях — гэта шлях дзесяткаў і сотень працоўных былой панскай Польшчы.

Нарадзілася Дульчэўская ў 1900 годзе ў горадзе Брэсце. Бацька яе працаваў на чыгунцы рабочым. Сама яна ў 1921 годзе пайшла працаваць на завод, дзе працуе і зараз. Ад беспраўнай жанчыны, якой яна была ў панскай Польшчы, тав. Дульчэўская пры совецкай уладзе дайшла да брыгадзіра перадавой стаханаўскай брыгады. Брыгада Дульчэўскай да дня XXIII гадавіны Кастрычніка выканала выгворчае заданне на 185 процантаў.

— Мне ніколі, нават, і не снілася, — гаворыць усхваляваная тав. Дульчэўская, — што мне акажуць такую высокую чэсць. Я абяцаю чесна служыць народу і па-сталінску апраўдаць давер'е, аказанае мне працоўнымі.

У прынятай пастанове ўдзельнікі нарады аднадушна падтрымоўваюць кандыдатуру Екацярыны Вікенцьеўны Дульчэўскай, вылучанай калектывам рабочых і служачых водачнага завода „Вызваленая праца" кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета дэпутатаў працоўных.

Нарада абрала 7 даверaных асоб на выбарчыя ўчасткі Цэнтральнай выбарчай акругі № 5 па выбарах у абласны Совет дэпутатаў працоўных.

Ал. Галін.

Сем калгасаў Шчолкаўскага раёна Маскоўскай вобласці на р. Воря будуюць сваю гідраэлектрастанцыю. У снежні 1940 г. станцыя дасць калгасам электраэнергію.
Злева направа: Г. В. Машын — прараб і І. М. Парфенаў начальнік будаўніцтва правяраюць праектную адзнаку катлавана плаціны.
Фота Н. Аляксеева. *Фота ТАСС.*

Адкрыты ўрок — сродак павышэння якасці работы настаўніка

У педагагічнай практыцы прымяняецца на гэтага часу адкрыты ўрок. Настаўнік раней прадумвае сваю тэму, складае падрабязны план урока, прадумвае методыку яго правядзення. На ўроку прысутнічаюць паасобныя педагогі, якія пры абгаварэнні ўрока даюць тыя або іншыя крытычныя заўвагі. Адкрыты ўрок дапамагае настаўніку прадумаць усе дэталі, якія адыгрываюць немалаважную ролю ў арганізацыі педагагічнага працэса.

Настаўнік Тэненбаум — выкладчык матэматыкі 12 сярэдняй школы — праводзіць урок геаметрыі ў 9 класе. Тэма ўрока — паняцце аб даўжыні акружнасці. Настаўнік павінен падвесці вучняў 9 гэ класа к лагічнаму засваенню даўно вядомага ім „2 пч". Але настаўнік раней выклікае двух-трох вучняў, правярае мінулы ўрок, устанаўлівае сувязь з новым урокам. Вучаніца Тэненбаум па-дзелавому расказвае, што ўпісаны многакутнік заўсёды меншы апісанага: гэта важна, каб у далейшым даказаць, што даўжыня ўпісанага ў круг многакутніка імкнецца да даўжыні акружнасці. Цяпер вазьміце свае сшыткі, алоўкі, цыркулі і ўпішыце шасцікутнік, — звяртаецца ён да вучняў. Апошнія добрасумленна, акуратна выконваюць.

— З'двойце шасцікутнік, атрымліваецца 12-кутнік, потым 24-кутнік і г. д. Вучні ўпэўніваюцца, што ўвесь час павялічваючы многакутнік, павялічваецца і імкнецца да даўжыні акружнасць. Перыметр многакутніка вучні ўжо даўно навучыліся знаходзіць. Такім чынам яны паступова робяць самі, на аснове нагляданняў, вывад адносна паняцця даўжыні акружнасці. Пасля таго, як мэта была дасягнута, замацоўваецца матэрыял. Вучні падагульняюць, а затым настаўнік з мэтай запамінання велічыні „п" дае формулу па аналогіі. „п" па велічыні мае столькі лічб, колькі слоў мае фраза. Колькасна кожная лічба раўняецца колькасці літар у слове. Гэта яшчэ больш зацікавіла вучняў. Гэты ўрок быў выдатны.

Сапраўды, адкрыты ўрок паказаў, што і матэматыка можа захапіць вучняў пры ўмелым выкладанні яе. Настаўнік тлумачыў урок упэўнена, шчыра, спакойна, вытрымана. Урок абгаварваўся на метадычнай нарадзе матэматыкаў 12 СШ. Члены гэтай нарады аказалі яму строгімі суддзямі; яны ніводнай дэталі не выпускаюць. Спрэчным было пытанне: ці добра зрабіў настаўнік, даўшы чарцёж вучням рабіць на партах, ці можа лепш было-б выклікаць лепшага вучня да дошкі, які-б ля дошкі малявау акружнасць. Але і ў спрэчках заўсёды нараджаецца ісціна.

Метадычная нарада вырашыла правільна і гэтае пытанне. Настаўнік правільна зрабіў, што даў вучням самастойна выканаць чарцёж. Гэта развівае іх самастойнасць у рабоце, развівае ўпэўненасць, а галоўнае развівае творчую думку рабят. У тым выпадку, калі-б быў выкліканы лепшы вучань да дошкі — [illegible] усе [illegible] пакалькі адкрыты ў[illegible] ца паказчыкам метадычн[illegible] насці ўрока, [illegible] столькі ён п[illegible] быць раней пр[illegible] быць улічаны [illegible] дробязі.

Метадычная нарада матэматыкаў 12 СШ (кіраўнік т. Шмірэр) сур'ёзна падыходзіць да гэтай спрэчкі. Яна распрацоўвае метады праходжання паасобных матэматычных праблем.

Тав. Шмірэр — выкладчык матэматыкі 12 СШ, як і тав. Тэненбаум сур'ёзна працуюць над сабой, яны глыбока рыхтуюцца да правядзення ўрокаў, а таму іх урокі змястоўны, насычаны элементамі навуковасці, таму вучні любяць прадмет. Яны карыстаюцца сярод дзяцей вялікім аўтарытэтам. Яны любяць свой прадмет, любяць сваю работу.

Урок каштоўны тым, што вучні самі прымалі актыўны ўдзел у вызначэнні паняцця акружнасці. Настаўніку ўдалося ўцягваць вучняў у актыўную работу, вучні самі дайшлі да вырашэння тэмы ўрока.

Н. А. Рабоўскі.

ВЫСОКАЯ АКТЫЎНАСЦЬ

Памяшканне Ліноўскай школы, Пружанскага раёна не магло змясціць усіх упаўнаважаных акруговай прадвыбарчай нарады, якія сабраліся, каб падтрымаць вылучаную кандыдатуру ў дэпутаты абласнога Совета дэпутатаў працоўных па Ліноўскай выбарчай акрузе № 54 таварыша Сцяпана Ільіча Чэрнуха — старшыню Ліноўскага сельсовета. Сюды прыйшлі прадстаўнікі працоўных ад 4 вакольных сельсоветаў: Ліноўскага Агароднікаўскага, Шакуноўскага і Чэхецкага.

Старшыня акруговай выбарчай камісіі тав. Кружкін першае слова прадастаўляе кандыдату ў дэпутаты тав. Чэрнуха. З вялікай увагай прысутныя слухаюць выступленне Сцяпана Ільіча Чэрнуха, які ў простых словах расказвае свой жыццёвы шлях ад батрака ў памешчыка да кіраўніка сельсовета.

За сваю рэвалюцыйную дзейнасць пры ўладзе польскіх паноў тав. Чэрнуха неаднаразова быў пад судом і ў апошні час быў асуджан на 8 год турэмнага зняволення. Толькі дзякуючы Чырвонай Арміі ён быў вызвалены з турмы і з першых дзён устанаўлення Совецкай улады ўключыўся ў актыўную работу па будаўніцтву сацыялізма на вызваленай зямлі.

Выступаўшыя на нарадзе прадстаўнікі працоўных ад розных вёсак горача і аднадушна падтрымалі кандыдатуру тав. Чэрнуха. Яны заяўлялі, што іх кандыдат з чэсцю апраўдае аказанае яму давер'е. Тав. Казловіч у сваім выступленні сказаў:

— Мы памятаем, як у гэтай школе адбываліся выбары ў польскі сейм. Мы падавалі свае галасы за памешчыкаў-паразітаў. Гэтага мы не жадалі рабіць, але нас прымушалі галасаваць за тых кандыдатаў, якія абаранялі інтарэсы памешчыкаў і капіталістаў. Зараз пры совецкай уладзе мы свабодна вылучаем у органы кіраўніцтва дзяржавай нашых людзей, прадстаўнікоў ад рабочых і сялян. Тав. Чэрнуха з'яўляецца сапраўдным прадстаўніком працоўных сялян, ён поўнасцю апраўдае наша давер'е.

Упаўнаважаны ад вёскі Лінова тав. Якута гаворыць аб тав. Чэрнуха, як аб чуткім кіраўніку і дастойным прадстаўніку ў органы совецкай улады.

— За некалькі месяцаў, — гаворыць тав. Якута, — Чэрнуха вывеў наш сельсовет у рады перадавых у раёне. Мы ўпэўнены, што ён чесна будзе працаваць на карысць нашай краіны, на благa працоўнага народа.

Выступленні ўпаўнаважаных прайшлі дружна і арганізавана на высокім палітычным узроўні. Нарада аднадушна падтрымала кандыдатуру тав. Сцяпана Ільіча Чэрнуха, які на сходах сялян вылучан кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета.

Нарада вылучыла даверaных асоб з ліку лепшых актывістаў тт. Корбана Н., Шырма Ф., Салтона, Майсейчука і Патапчука.

Арганізавана і пры вялікай актыўнасці ўпаўнаважаных прайшлі прадвыбарчыя акруговыя нарады па Хоробускай выбарчай акрузе № 56, Пружанскай гарадской выбарчай акрузе № 52 і іншых.

М. Гурэвіч.

Комсамольцы — агітатары

Актыўны ўдзел у агітацыйна-масавай рабоце па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных прымаюць комсамольцы Антопальскага раёна. Ва ўсіх первічных комсамольскіх арганізацыях праведзены [illegible] комсамольцаў і [illegible] а пытанню іх [illegible] [illegible] ніцца ў насельніцтва ко[illegible] мольцы, работаючыя агітатарам[illegible] ў выбарчых камісіях. Добра арганізавалі агітацыйна-масавую работу сярод насельніцтва агітатары тт. Чэрнякоў, Федчэня, Дударук, Дземідзюк М., Дземідзюк І., Варсук О. і другія.

[illegible] МВ праведзена [illegible] рымогаў, на[illegible] спяховае правя[illegible] — сход комса[illegible] ава, сход дапрызыў[illegible]

[illegible] пшага абсалютуван[illegible] х мастацкай самадзей[illegible] ізаваны і стала пра[illegible] раматычныя, харавыя, [illegible] ныя гурткі. Драматычны [illegible] ры Антопальскім Доме [illegible] ры зрабіў пастаноўку [illegible] — Катаева „Пагранічнікі". [illegible] рытуе п'есу „Людзі" — Шолам-Алейхема. Біон.

[illegible] ыдаткоўваць дзяржаўныя сродкі

[illegible] номнае выдат[illegible] ўных сродкаў [illegible] ейшай задачай [illegible] а соцыялістычна[illegible] ва. Гэту задачу з [illegible] паставіў у сваіх [illegible] рашэннях XVIII з'е[illegible] асобных прадпрыемстваў і гаспадарчых арганізацый обласці не выконваюць патрабаванняў партыі і ўрада аб беражлівых адносінах да дзяржаўных сродкаў. Каб сапраўдзіць гэта мы прыводзім некалькі характэрных прыкладаў з дзейнасці раду кіраўнікоў машына-трактарных станцый.

Былы дырэктар Маларыцкай машына-трактарнай станцыі Дашчэнка прысвоіў сабе 1847 рублёў дзяржаўных сродкаў. Карыстаючыся бескантрольнасцю, ён фабрыкаваў фіктыўныя рахункі. Атрыманую ад дзяржавы маёмасць прыходаваў, як закупленую і атрымоўваў за гэта грошы. Набываў за дзяржаўны рахунак рэчы для асабістага карыстання.

Галоўны бухгалтар гэтай МТС Емельянаў, які заклікан ажыццяўляць кантроль за выдаткаваннем дзяржаўных сродкаў, сам залез у кішэню дзяржавы і прысвоіў сабе 2.344 рублі. Касір Багнюк таксама не адстаў ад сваіх кіраўнікоў і прысвоіў 469 рублёў.

Бюджэтныя сродкі ў гэтай МТС выкарыстоўваліся не па прызначэнню. У результаце безгаспадарчасці, нават не гледзячы на тое, што план трактарных работ не выканан, тут дапушчан перавыдатак дзяржаўных сродкаў у суме 4.889 рублёў.

У Пружанскай МТС (дырэктар Шпакоўскі) гаручыя і змазачныя матэрыялы выдаткоўваюцца выключна бескантрольна. Вытвораная рэвізіяй выяўлена, што на працягу некалькіх месяцаў за асобнымі брыгадзірамі і трактарыстамі лічыцца недахоп гаручага (газы) 5.712,5 кілограма на суму 8 998 рублёў. В ноўныя ў гэтым недахопу да гэтага часу не прыцягнуты да адказнасці.

У сталоўцы гэтай МТС адсутнічае ўлік і гэтым самым ствараецца магчымасць для разбазарвання і раскрадання прадуктаў і грашовых сродкаў. Дырэктар МТС Шпакоўскі, замест наведзення парадку ў фінансавай гаспадарцы, сам займаецца прысвойваннем дзяржаўных сродкаў. Ён пад відам камандыровачных незаконна атрымаў 250 рублёў.

У Ружанскай МТС (дырэктар Азерскі) выяўлен недахоп гаручага на 2.600 рублёў. З дазволу дырэктара тут дапускалася незаконная аплата рахункаў і выплата камандыровачных. Дэбіторская запазычанасць МТС дасягнула 4112 рублёў, а крэдыторская — 23.764 рублі. З асігнаваных па промфінплану сродкаў на выкананне плана трактарных работ выкарыстана не па прызначэнню 11.925 рублёў. У результаце гэтага зарплата рабочым і служачым выплачваецца несвоечасова.

Падобныя факты маюць месца і ў Гаўнаўскай, Дамачэўскай і іншых МТС.

Але разам з гэтым ёсць МТС, якія адначасова з якасным і колькасным выкананнем плана трактарных работ, дабіліся вялікай эканоміі дзяржаўных сродкаў. Напрыклад, Клышчэльская МТС (дырэктар Казлоўскі) датэрмінова перавыканала план трактарных работ і зэканоміла па ўсіх артыкулах сметы выдаткаў 18329 рублёў дзяржаўных сродкаў.

У справе кантролю за правільным выдаткаваннем бюджэтных сродкаў вялікая роля належыць рабочым аддзяленням дзяржбанка. Яны абавязаны штодзённа сачыць за фінансавай і гаспадарчай дзейнасцю кожнага кіраўніка. Аднак некаторыя інспектары рабочых аддзяленняў дзяржбанка па фінансаванню МТС адносяцца да сваёй работы фармальна.

Усе гэтыя факты патрабуюць навядзення большавіцкага парадку ў фінансавай гаспадарцы кожнай МТС.

Голядаў,
ревізор аблфінаддзела.

Лелуеў,
галоўны бухгалтар аблса.

Выбарчая кампанія ў Карэла-Фінскай ССР. Комсамолкі-актывісткі Часовага ўпраўлення горада Выпуры (Выборг) складаюць спісы выбаршчыкаў. Злева направа: В. Г. Васільева, Н. І. Рухлін, В. В. Малчанава і А. Д. Агеева.
Фота Г. Чэртова *Фота ТАСС.*

[illegible] капіталаў у свеце, што людзі, якія авалодалі тэхнікай, могуць тварыць цуды. Я зразумеў, што пуць, які намячае таварыш Сталін, — гэта пуць да шчасця людзей, да дабра для ўсяго народа. І я стаў вывучаць тэхніку, стаў вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю, стараўся як мага вышэй падняць прадукцыйнасць працы.

Што я зрабіў як стахановец?

Пры дапамозе асаблівых прылад да свайго станка я стаў апрацоўваць некалькі дэталей адначасова некалькімі фрэзамі. Гэтым я дасягаю рэзкага скарачэння машыннага часу. Напрыклад, хуткасць рэзання ў мінуту вызначана па норме ў 20 метраў, а ў мяне хуткасць рэзання даходзіць да 34 метраў у мінуту.

У працэсе работы я выкарыстоўваю не толькі рабочы, але і халасты ход стала (метад зваротнага фрэзеравання). Так я дабіваюся ўскарэння працэса апрацоўкі дэталей.

У адным з маіх апошніх суседніх рекордаў (гэта быў 9-ы рекорд) я работаў адначасова 13-ю фрэзамі і выпрацаваў за змену [illegible] норм.

[illegible] ны этапам маёй стахановскай дзейнасці быў пераход [illegible] работу на двух фрэзерных [illegible] аб славе кіравалі рекордаў, — мяне натхніла думка аб тым, што падняцце прадукцыйнасці працы прынясе велізарную карысць заводу, на якім я працую, усёй совецкай прамысловасці. Слава прышла ўжо потым, сама сабой, калі аб маіх рекордах паявіліся заметкі і артыкулы ў газетах, калі аб гэтым дазналася ўся краіна, калі ў мяне, як і ў другіх стаханаўцаў, паявілася многа паслядоўцаў і вучняў.

Стаханаўская праца раскрыла мне вочы на жыццё, адкрыла мне новыя гарызонты. Тое-ж самае адбылося і з тысячамі, дзесяткамі тысяч другіх рабочых, якія праславіліся стаханаўскай працай.

* * *

Мы ўсе ўважліва сочым за тым, як перабудоўваецца жыццё ў новых совецкіх рэспубліках, як разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва на заводах Рыгі і Таліна, Каўнаса і Кішынёва, Львова і Белас[illegible] рабочыя Літвы, Латвіі, Эстоніі, Бе[illegible] Чаўночнай Буковіны, [illegible] абласцей Украіны і Бе[illegible] прыемствах, якімі к[illegible] і в рабочага класа, [illegible] прадукцыйнасць пра[illegible]

Радасна б'ецца [illegible] калі чытаеш аб творчай [illegible] цоўных у новых совец[illegible] ліках і абласцях. Успамін[illegible] [illegible] ныя словы нашага [illegible] на[illegible] стаўніка Владзіміра Ільіча Леніна, напісаныя ім неўзабаве пасля Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі:

„Кожная фабрыка, дзе выкінут вон капіталіст або хоць-бы абуздан сапраўдным рабочым кантролем, кожная вёска, дзе выкурылі памешчыка-эксплуататара і адабралі яго зямлю, з'яўляецца цяпер і толькі цяпер, попрышчам, на якім можа праявіць сябе чалавек працы, можа разагнуць намнога спіну, можа выпрамі[illegible]ца, можа адчуць сябе чалавекам". (Том XXII, стар. 161).

Гэтыя словы як нельга лепш падыходзяць зараз да той абстаноўкі, у якой жывуць і творацца працаўні[illegible] нашых новых брацкіх рэспублік і абласцей. Яны атрымалі права на працу — найвялікшае заваяванне чалавека. Яны карыстаюцца гэтым правам таксама, як і мы, для павелічэння грамадзкага багацця, для ўздыму матэрыяльнага і культурнага узроўню працоўных, для павелічэння магутнасці сваёй рэспублікі і нашай агульнай бацькаўшчыны — вялікага Совецкага Саюза.

Я шлю гарачае стаханаўскае прывітанне новым совецкім грамадзянам!

Іван Гудаў,
дэпутат Вярхоўнага Совета СССР.

Масква.

Па гарадах Совецкага Саюза. Дом пісьменнікаў у Кіеве
Фота Б. Казюка *Фота ТАСС*

Радыёвузел у Бярозе

У горадзе Бяроза абсталяван і здан ў эксплоатацыю радыёвузел. Остні працоўных раённага цэнтра атрымалі магчымасць правесці сабе на кватэру радыё і слухаць перадачы з чырвонай сталіцы Масквы і сталіцы БССР Мінска.

Лепшых людзей — у гарадскі Совет

На ўсіх участках Брэсцкага чыгуначнага вузла адбыліся сходы па пытанню вылучэння кандыдатаў у дэпутаты гарадскога Совета дэпутатаў працоўных.

Урачыста і з высокім палітычным уздымам прайшоў сход рабочых, служачых і ІТР паравознага дэпо. Пасля змястоўнага даклада сакратара партбюро дэпо т. Родзіна аб 23 гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, была ўнесена прапанова вылучыць кандыдатаў у гарадскі Совет. Першым узяў слова рабочы т. Шчэрба.

— Год таму назад, — гаворыць ён, — працоўныя Заходняй Беларусі і Украіны былі бесправнымі. З дапамогай вялікага Совецкага Саюза яны сталі вольнымі, атрымалі правы на аснове самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі. Сёння мы павінны вылучыць кандыдатаў у дэпутаты гарадскога Совета. Гэта вялікая і адказная справа. У горсовет мы павінны паслаць лепшых вашых людзей, стаханаўцаў вытворчасці, якія будуць там працаваць, як гэтаму вучыць Комуністычная партыя і т. Сталін і апраўдаюць наша давер'е. Я лічу, што адным з дастойных кандыдатаў будзе т. Апанасевіч Раман Іванавіч — машыніст-стаханавец.

Выступіўшыя т.т. Кузняцоў, Дубовік і іншыя падтрымліваюць прапанову тав. Шчэрбы.

Адзін за адным вылучаюцца яшчэ шэсць кандыдатаў у дэпутаты горсовета. Кожную кандыдатуру ўсебакова абгаварваюць, не гледзячы на тое, што ўсе яны і так добра вядомы ўсім рабочым дэпо.

Пасля абгаварэння сход аднадушна вылучыў кандыдатамі ў дэпутаты горсовета т.т. Апанасевіча Р. І. — машыніста-стаханаўца, Родзіна Фёдара Міхайлавіча — сакратара партбюро дэпо, Тупіцына Міхаіла Паўлавіча — першага сакратара абкома партыі, Глебаву Праскоўю Глебаўну — жонку машыніста, актыўную работніцу сярод жонак чыгуначнікаў, Даніловіча Анатолія Сцяпанавіча — старшыню мясцкома дэпо, які два разы быў судзім польскім судом за рэвалюцыйную работу, Каўко — машыніста-стаханаўца і т. Левіна Паўла Васільевіча — маладога інжынера-планавіка.

Агульны сход рабочых, служачых і ІТР галоўных вагонных майстэрняў у колькасці 310 чалавек вылучыў кандыдатамі ў горсовет т.т. Германовіча — брыгадзіра сталярнага цэха, Аўчарэк Ольгу — лепшага токара-стаханаўку, Бароўка — кантралёра-прыёмшчыка, вылучанага з рабочых, Кокараву Анну — старшага бухгалтара, так сама вылучаную з работніц, Цімашэнка — брыгадзіра і Беляева С. М. — сакратара абкома партыі.

Рабочыя станцыі Брэст-Цэнтральная вылучылі кандыдатамі ў дэпутаты горсовета т.т. Асіповіча — стрэлачніка-комбамольца і Рашчынскага — загадчыка транспартным аддзелам абкома партыі.

Усе таварышы, вылучаныя чыгуначнікамі кандыдатамі ў дэпутаты горсовета, — лепшыя з лепшых, праверэныя на рабоце людзі. Яны ўпаўне апраўдаюць давер'е працоўных.

А. Кудрын.

Закончы[illegible] рэгістрацыю кандыдатаў у дэпутаты раённага Совета

У Дзвінскім раёне закончылася рэгістрацыя кандыдатаў у раённы Совет дэпутатаў працоўных, вылучаных многалюднымі сходамі [illegible] цямі раёна.

Па Чэмерс[illegible] № 17 зарэгі[illegible] там у дэпутаты [illegible] тав. Лапацін К[illegible] віч, 1896 года нар[illegible] КП(б)Б, беларус, с[illegible] бнага выканаўчага к[illegible]

Па Дарапеевіцкай выбарчай акрузе № 8 з[illegible] раван кандыдатам у деп[illegible] бнага Совета тав. Кавал[illegible] фан Мітрафанавіч, 1907 [illegible] ражэння, член КП(б)Б, раённага камітэта партыі.

Кандыдатам у дэпутаты раённага Совета па Белаазёрскай выбарчай акрузе № 25 зарэгістрыраван тав. Беспалаў Міхаіл А[illegible]ксандравіч, 1907 года нараджэння, член КП(б)Б, начальнік раённага аддзела НКВД, вылучаны агульным сходам работнікаў міліцыі і сходам рабочых і служачых Белаазёрскага канала.

Акруговая выбарчая камісія па выбарах у раённы Совет зарэгістрыравала кандыдатам у дэпутаты раённага Совета па Паўлопальскай выбарчай акрузе № 11 [illegible] сялянку вёскі Бельск, Новасёлкаўскага сель[illegible] совета, лепшую [illegible]ктывістку Ва[illegible] совецкав[illegible] у ліку [illegible] дыдатаў — [illegible]ніца Нава[illegible] сярэдняй ш[illegible] раўна Грэк, у[illegible] раторы Лідзія [illegible] рушына, калга[illegible] дарчай агрэлі[illegible] Матрона Васільеў[illegible] ка-аднаасобніца в[illegible] Таццяна Іванаўна Ка[illegible]

ЖЫЦЦЁ ЧЫРОВОНАЙ АРМІІ

МЕХАНІК-ВАДЗІЦЕЛЬ ФРАЛОЎ

Камандзіра аддзялення тав. Фралова ведаюць у падраздзяленні, як сур'ёзнага, удумлівага і ведамага сваю справу механіка-вадзіцеля, для якога няма „тайн" у машыне, няма „загадак", якія-б змаглі паставіць у тупік.

Як доктар ведае будову чалавечага цела і умее папярэдзіць многія хваробы, так механік-вадзіцель тав. Фралоў вывучыў жалезны арганізм баявой машыны, ведае і можа папярэдзіць любы дэфект у ёй.

Выехаўшы на тактычнае вучэнне, машына тав. Фралова ішла на чале калоны. Плаўна і рытмічна гудзеў матор. Механік-вадзіцель уважліва прыслухоўваўся да работы механізма. Раптам шум матора пачаў мяняцца. Вопытны вадзіцель адразу вызначыў прычыну, хутка астанавіў машыну і пачаў аглядаць матор. Адзін з клапанаў аказаўся сапраўды разрэгуліраваным. Фралоў хутка адхіліў дэфект. Не паспелі ўдзельнікі экіпажа зразумець у чым справа, як ён зноў сядзеў за рычагамі і кіраваў машынай.

Выдатна вывучыў машыну тав. Фралоў. У яго дастаткова во[illegible] [illegible] гады работы [illegible] [illegible] ні [illegible] [illegible] [illegible]